ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1979 г.
27 верасня
ЧАЦВЕР
№ 26 (1252)

Цана 2 кап.

# АДКАЗНЫЯ ЗАДАЧЫ

Дзякуючы клопатам партыі і ўрада ў нашай краіне створаны ўсе ўмовы для творчага авалодання ведамі, развіцця грамадска-палітычнай актыўнасці і талентаў моладзі. Новым яркім прыкладам гэтага клопату з'явілася Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў».

Галоўную ўвагу, адзначаецца ў пастанове, патрэбна сканцэнтраваць на паляпшэнні якасці прафесіянальнай падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання кадраў, умацаванні сувязей з вытворчасцю, практыкай камуністычнага будаўніцтва. Вялікая і грунтоўная размова аб развіцці навукі адбылася і на нядаўнім пленуме ЦК КП Беларусі.

**Студэнцкія гады — пара прафесіянальнага і сацыяльнага станаўлення маладога чалавека. У нашым універсітэце займаецца амаль 18 тысяч студэнтаў. У аспірантуры вучыцца звыш 600 аспірантаў на 73 спецыяльнасцях.**

Вучоба ў ВНУ — гэта галоўная праца студэнта. І ад таго, наколькі актыўны студэнт, як умее арганізаваць сваю работу, наколькі будзе імкнуцца пастаянна папаўняць свае веды, залежыць яго агульнаадукацыйны ўзровень.

Важкае слова ў гэтай справе павінны сказаць камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў, якім неабходна пастаянна вывучаць прычыны слабай паспяховасці будучых спецыялістаў, эфектыўней выкарыстоўваць формы маральнага і матэрыяльнага заахвочвання. Належыць значна падымаць аўтарытэт ленінскіх і імянных стыпендыятаў, выдатнікаў вучобы, тых, хто з семестра ў семестр вучыцца на «добра» і «выдатна».

**Гады вучобы ў вышэйшай навучальнай установе — гэта час найбольш інтэнсіўнага развіцця інтэлектуальных і маральных сіл і магчымасцей маладога чалавека. Будучаму спецыялісту патрэбна вучыцца і творча працаваць з людзьмі, умець выкарыстоўваць прынцыпы навуковай арганізацыі працы, цаніць калектыўны вопыт, быць граматным і эрудзіраваным чалавекам.**

Пастанова ставіць вялікія задачы перад усімі работнікамі і арганізацыямі вышэйшай школы, якім неабходна выпрацаваць канкрэтныя, дзейсныя меры па далейшаму ўдасканаленню сваёй работы. Галоўная ўвага пры гэтым павінна быць звернута на рэзультатыўнасць, на рэальны эфект усіх складаемых вучэбна-выхаваўчага працэсу. Але не трэба забываць папярэджанне першага сакратара ЦК КПБ П. М. Машэрава, якое прагучала на рэспубліканскім сходзе партыйнага актыву, што «...педагагічныя калектывы маюць добрыя планы, у якіх усё распісана, усё як быццам бы прадугледжана. Праводзіцца шмат розных мерапрыемстваў... Але часам эфект усяго гэтага невысокі, бо ў выхаванні моладзі ўпор робіцца на колькасць мерапрыемстваў, а гэта зусім не тоесна самаму выхаванню».

Належыць заўсёды памятаць ленінскае ўказанне аб тым, што ідэйна-палітычная накіраванасць лекцый, іх змест вызначаецца «...выключна саставам лектараў». Менавіта ад лектараў, іх эрудзіцыі, палітычнай сталасці, прафесіянальнага майстэрства ў першую чаргу залежыць працэс фарміравання ў студэнтаў навуковага мыслення і марксісцка-ленінскага светапогляду.

**Ва універсітэце працуе звыш 2 тысяч навукова-педагагічных супрацоўнікаў. Сярод іх — 9 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, каля 100 дактароў і прафесараў, звыш 700 дацэнтаў і кандыдатаў навук. І кожны выкладчык павінен дабіцца, каб лекцыі насілі, як гэтага патрабуе прынятая пастанова, «праблемны характар, адлюстроўвалі актуальныя пытанні тэорыі і практыкі, сучасныя дасягненні грамадскага і навукова-тэхнічнага развіцця, садзейнічалі паглыбленай самастойнай працы».**

Прафесіянальнае, працоўнае выхаванне студэнтаў звязана з іх ідэйна-палітычнай загартаванасцю, з выпрацоўкай у моладзі актыўнай жыццёвай пазіцыі, фарміраваннем у яе высокіх маральных патрабаванняў. І далейшае павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў ставіцца ў прамую залежнасць ад умацавання ролі кафедр — асноўнага звяна вышэйшай навучальнай установы. Менавіта кафедра павінна вызначаць змест і адзінства вучэбнага, навуковага і выхаваўчага працэсу.

**Вучэбна-выхаваўчую, навукова-даследчую і метадычную работу ў нас ва універсітэце ажыццяўляюць 104 кафедры, 3 вучэбна-навуковыя станцыі, 2 навукова-даследчыя інстытуты, 3 праблемныя лабараторыі. Ад іх намаганняў залежыць, каб дыплом, які дае універсітэт сваім выхаванцам, быў сведчаннем не толькі глыбокіх ведаў, але і высокай грамадзянскасці, палітычнай сталасці.**

Ідэі і думкі, выкладзеныя ў Пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» павінны стаць для кожнага выкладчыка, студэнта, супрацоўнікаў усіх факультэтаў, кафедраў, акадэмічных груп універсітэта кіраўніцтвам да дзеяння. Ад гэтага ў канчатковым выніку будзе залежыць, каб на заводы і ў навуковыя лабараторыі, у школы і тэхнікумы з нашага універсітэта прыходзілі спецыялісты ўсё больш высокага ўзроўню падрыхтоўкі, усё больш энергічныя, дапытлівыя, усё больш адданыя сваёй справе.

**60-ГОДДЗЮ ЛКСМБ — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ**

# ЗАМАЦОЎВАЮЦЬ ПРАКТЫКАЙ

Як праходзіць практыка ўсіх хімікаў-пяцікурснікаў расказаць немагчыма. Усе «распісаны» ў розныя месцы, працуюць на розных прадпрыемствах. Але частка студэнтаў пакінута на кафедрах факультэта. Вось да іх я і заглянуў у «госці».

Калі гаворка зайшла аб цікавасці практыкі, якую яны праходзяць, усе з натхненнем пачалі расказваць аб сваёй рабоце.

Генадзь Саскевіч вельмі задаволен тым, што трапіў на кафедру радыяцыйнай хіміі. Тут ён займаецца вывучэннем узаемаадносін этыленгліколю з рознымі металамі, высвятляе, ці адбываецца комплекснае з'яднанне з ім.







— І хоць яшчэ не ведаеш,— гаворыць ён,— ці спатрэбіцца ўсё гэта мне на тым месцы, куды прыйдзецца пайсці працаваць пасля заканчэння БДУ, усё роўна, атрыманыя веды, якія я зараз умацоўваю практычнай дзейнасцю, дарма не прападуць.

Вельмі цікавая і патрэбная работа ў дзяўчат, якія працуюць на кафедры аналітычнай хіміі. Пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў яны замяраюць працэнтны змест марганцу ў сплавах з дакладнасцю да чацвёртай лічбы фотаметрычным метадам.

— Ці шмат работы?

— Хапае, — адказвае Наталля Калтунова.— Прыходзіцца вычэрчваць шмат графікаў, запісваць шмат вынікаў. Наогул, даследаванне кінетыкі адбелкі цэлюлозы ў газавай фазе патрабуе максімум уважлівасці і старання, займае шмат часу.

Пяцікурснікі не праводзяць дарэмна час. Не за гарамі абарона дыпломаў. Верыцца, што ідучы насустрач 60-годдзю ЛКСМБ, яны абароняць свае дыпломныя работы на «добра» і «выдатна». А потым перад цяперашнімі выпускнікамі адкрыецца доўгі працоўны шлях у адной з найцікавейшых навук — хіміі.

Фота і тэкст
**А. Дабрыяна.**

**● ВЫБАРЫ Ў КАМСАМОЛЕ**

# СТАЎ КАМСОРГАМ КАМІСАР

Першакурснікі фізічнага факультэта ў гэтым годзе першае студэнцкае выпрабаванне працай праходзяць у Быхаўскім раёне Магілёўскай вобласці. За прайшоўшы перыяд студэнты паспелі пазнаёміцца і пасябраваць. Выявіліся лідэры ў працы, у арганізацыйнай і культмасавай рабоце.

У кожнай з 9 камсамольскіх груп першакурснікаў нядаўна прайшлі выбарчыя сходы, на якіх камсамольцы выбралі камсоргаў і бюро груп. Важакамі сталі найбольш вопытныя юнакі і дзяўчаты, якія ў час вучобы ў школе, службы ў радах Савецкай Арміі ці ў перыяд работы на прадпрыемствах прымалі актыўны ўдзел у камсамольскім жыцці. Напрыклад, Таня Клімовіч толькі што выбрана камсоргам 3-й групы. Яна яшчэ ў час уступных экзаменаў прыцягвала ўвагу якасцю ведаў, таварыскасцю, нейкім своеасаблівa чулым падыходам да сяброў. У ёй адчуваліся рысы нядрэннага арганізатара.

Дзяўчына з Гродзенскай вобласці стала камісарам зводнага студэнцкага сельскагаспадарчага атрада, які працуе ў саўгасе «Спутник», і аператыўна змагла наладзіць грамадскую і культмасавую работу. Студэнты ўжо выпусцілі некалькі нумароў насценгазеты, арганізавалі канцэрт мастацкай самадзейнасці. І, галоўнае, яны ўдарна працуюць на ўборцы ўраджаю. Значная заслуга ў гэтым — Тані Клімовіч, камісара ССГА, якая стала камсоргам.

**У. АДЖАЕЎ,**
**сакратар камітэта камсамола фізфака.**

ІНТЭРВ'Ю НУМАРА

# У прамой залежнасці

Трывогі і хваляванні ў час уступных экзаменаў уласцівы не толькі абітурыентам. Дэканаты кожнага факультэта зацікаўлены ў тым, каб чарговае папаўненне было як мага больш падрыхтаваным і здольным да вучобы ва універсітэце. Таму ўжо зараз, калі ўчарашнія абітурыенты, якім пашчасціла уліцца ў сям'ю студэнтаў БДУ, праходзяць першае выпрабаванне працай на калгасных і саўгасных палях рэспублікі, ва універсітэце, падводзячы вынікі прыёмнай кампаніі гэтага года, думаюць і аб тым, хто стане абітурыентам-80.

З некалькімі пытаннямі аб праблемах прыёму мы звярнуліся да дэкана хімічнага факультэта, кандыдата хімічных навук **В. Ф. ЦІКАВАГА.**

**— Вадзім Фёдаравіч, ці змяніўся конкурс на ваш факультэт у параўнанні з мінулым годам?**

— На дзённую форму навучання конкурс у гэтым годзе павялічыўся ў сярэднім на 22 працэнты. Дакладней, на вытворчы паток — на 25 працэнтаў, на педагагічны, адпаведна, — на 18 працэнтаў.

Але хімфак у гэтым плане амаль не адрозніваецца ад іншых факультэтаў. Прыкладна гэтак жа павялічыўся сёлета конкурс па ўсяму універсітэту.

**— Што канкрэтна, на вашу думку, можа зрабіць факультэт, каб павялічыць конкурс?**

— Раскажу, што ў гэтым плане робіцца непасрэдна ў нас.

Штогод вясной мы праводзім на базе хімфака рэспубліканскую алімпіяду па хіміі і тым самым выяўляем найбольш здольную школьную моладзь. Абавязкова пасылаем сваіх прадстаўнікоў на абласныя алімпіяды з мэтай правядзення адпаведнай агітацыі. Значную работу з настаўнікамі сярэдніх школ рэспублікі вядуць нашы выкладчыкі праз інстытут павышэння кваліфікацыі.

Акрамя таго, за кожнай кафедрай факультэта замацавана асобная вобласць рэспублікі і шэраг мінскіх школ, дзе вядзецца работа па прафесіянальнай арыентацыі. У гэтым годзе, напрыклад, нашы супрацоўнікі выступілі з лекцыямі аб факультэце ва ўсіх школах сталіцы Беларусі.

Да гэтага можна дадаць яшчэ і такую традыцыйную форму арыентацыі будучых абітурыентаў, як «Школа юных хімікаў», якая існуе на факультэце ўжо больш за 10 гадоў і аб'ядноўвае штогодна прыблізна 100—120 вучняў старэйшых класаў.

**— Праблема «вялікага конкурсу» мае два бакі. Ці не так?**

— Лепш за ўсё, давайце звернемся да лічбаў.

На 124 месцы, якія засталіся пасля залічэння на факультэт выпускнікоў падрыхтоўчага аддзялення, падалі заявы 83 медалісты. У астатніх прэтэндэнтаў не было ніводнага атэстата з сярэднім балам ніжэй за 4,5. Гэта адметны паказчык.

Пасля таго, як медалісты здалі экзамен па прафіліруючаму прадмету, конкурс на хімфак стаў 3,8 чалавекі на месца. Значная колькасць абітурыентаў з добрымі атэстатамі, нават некаторыя медалісты, не змаглі стаць у гэтым годзе нашымі студэнтамі.

Такім чынам, размова сёння ўжо павінна ісці і аб колькасці абітурыентаў на кожнае запланаванае месца, і аб якасці іх падрыхтоўкі, аб індывідуальнай агітацыйнай рабоце з выпускнікамі школ. Задача — выяўляць найбольш схільных да патрэбнай прафесіі юнакоў і дзяўчат.

**— І апошняе пытанне: ці плануецца што-небудзь новае ў арганізацыі і правядзенні чарговага прыёму на факультэт?**

— У асноўным будуць ужывацца традыцыйныя формы работы, аб якіх ужо сказана вышэй. Мне засталося дадаць зусім няמнога. У гэтым навучальным годзе паміж факультэтам і некаторымі вытворчымі прадпрыемствамі нашага профілю будуць заключаны двухбаковыя дагаворы аб супрацоўніцтве. Мы плануем адным з пунктаў гэтых дагавораў паставіць пагадненне аб тым, што прадпрыемства будзе арыентаваць на паступленне ва універсітэт найбольш падрыхтаваную і таленавітую моладзь. Але аб тым, як на справе будзе складвацца такая работа, гаварыць яшчэ вельмі рана.

Інтэрв'ю правяла **Т. САХАШЧЫК.**

# ПОЛЕ ПРЫМАЕ ЭКЗАМЕН

**ДЛЯ МНОГІХ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ СЁЛЕТНЯЯ «БУЛЬБА» НЕ ЗУСІМ ЗВЫЧАЙНАЯ. БО Ў САЎГАСЕ ІМЯ СМАЛЯЧКОВА БЫХАЎСКАГА РАЁНА, ДЗЕ ЯНЫ ПРАЦУЮЦЬ, БУЛЬБАЙ ЗАСЕЯНА ЎСЯГО КАЛЯ СТА ГЕКТАРАЎ. АСТАТНІЯ ПЛОШЧЫ АДВЕДЗЕНЫ ПАД ІНШУЮ ГАРОДНІНУ: АГУРКІ, МОРКВУ, КАБАЧКІ. ТАМУ АСНОЎНАЯ РАБОТА ВЯДЗЕЦЦА НА ГЭТЫХ КУЛЬТУРАХ. АЛЕ НЕ ЗАБЫТА І БУЛЬБА...**

## 1. ЗАДАЧА НУМАР АДЗІН

Дзень нам не ўсміхаўся. Быў пахмурны. Сонца не паказвалася. Некаторыя ў душы скептычна пасмейваліся: вось табе і «бульба»! Морква... І поле—вачыма не акінуць...

У саўгасе імя Смалячкова вырашчаны нядрэнны ўраджай морквы. Дапамагчы ўбраць яго, каб не пакінуць на полі ніводнай морквы, — задача нумар адзін ССГА журналістаў. «Морква» ў нашай працоўнай біяграфіі першая.

...Шамаціць у руках бацвінне. Вёдры напаўняюцца хутка. Старанне плюс уменне, вопыт даюць добры вынік. Толя Латоцін на кузаве машыны, толькі паспявае высыпаць вёдры... Са сваімі абавязкамі ён спраўляецца на «выдатна». Калі ў нас стомай наліваюцца рукі, яго кліч падбадзёрвае многіх: «Па аднаму вядру—і машына будзе поўнай!»

І адкуль з'яўляецца натхненне! Замільгаюць хутчэй рукі, пасыплюцца жарты і хтосьці зацягне песню.

Поле — вачыма не акінуць. Але з кожным днём шырыцца палоска, дзе морква ўжо ўбрана. Адыходзячы з поля, азіраемся, параўноўваем: ці многа зрабілі.

Нашы твары паспелі ўжо абветрыцца. І натруджаныя рукі пасля працоўнага дня, як ні старайся, усё ж такі выводзяць няроўныя радкі ў пісьмах дадому.

Але мы будзем доўга помніць цябе, незабыўны месяц!..

**Т. МАНЁНАК.**

## 2. СПОРЫЦЦА ПРАЦА

На ўборцы морквы норма выпрацоўкі складае 410 кілаграмаў на чалавека. Многа гэта ці мала можна зразумець, калі ўглядзецца ў стомленыя твары дзяўчат, якія тут працуюць. Штодзённае заданне перавыконваецца імі ў паўтара раза. Але Марыя Мітраховіч, камандзір жаночай брыгады, упэўнена, што спыняцца на дасягнутым нельга. Можна працаваць значна лепш і рабіць значна больш. На агульным камсамольскім сходзе было вырашана арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва. І ў першых жа нумарах «маланкі» з'явіліся прозвішчы лепшых: Ірыны Гусько, Жанны Пагарэлавай, Надзеі Гапасюк і іншых. А брыгада сарціроўшчыкаў бульбы была прызнана пераможцай па выніках тыдня. «Баявой шасцёркай» называюць яе ў атрадзе. Бо працуюць тут сапраўдныя майстры сваёй справы: Аляксандр Марчанка, Ігар Мартынаў, Уладзімір Лісоўскі і іншыя. На факультэт яны прыйшлі з радоў Савецкай Арміі. А гэта значыць, што баявая загартоўка, мужнасць і вытрымка, якія яны атрымалі ва Узброеных Сілах, спатрэбіліся ім і зараз. Таму кіпіць і спорыцца ў іх праца. Кожны дзень у магазіны горада Магілёва адсюль паступае звыш дваццаці тон адсарціраванай бульбы вышэйшага гатунку.

Немагчыма было б дабіцца такіх паказчыкаў у працы, калі б не ведалі ў атрадзе ўсмешкі і жартаў. І той, хто сваім добрым настроем дапамагае пераадолець стому і цяжкасці, па праву лічыцца аптымістам. Гэта Аляксандр Гайдук і Таццяна Пазнякова, Павел Уладзіміраў і Кацярына Агеева. Усіх не пералічыш. Дарэчы, Кацярына Агеева яшчэ і арганізатар музычных нумароў у канцэрце, які з поспехам паказалі студэнты мясцоваму насельніцтву, а Таццяна Пазнякова адказвае за выпуск насценнай газеты «Вяршкі і карэньчыкі».

**С. ЛЫСКАВЕЦ.**

## 3. НАРАДЖАЕЦЦА КАЛЕКТЫЎ

Студэнцкае жыццё, вясёлае, імклівае пачынаецца звычайна з сельгасработ. У час сумеснай працы нараджаецца калектыў, па-сапраўднаму пазнаюць адзін аднаго студэнты, пачынаюць сябраваць...

Для першакурснікаў факультэта журналістыкі першае выпрабаванне працай праходзіць на партызанскай Быхаўшчыне. Штаб ССГА складаецца з камандзіра Дзімітрыя Іванова, камісара Аляксея Новікава і студэнтаў, якія адказваюць за арганізацыю мастацкай самадзейнасці і шэфскай дапамогі ў саўгасе. Рабяты працуюць у дзве змены на бульбаўборачных камбайнах. Амаль кожны дзень перавыконваецца норма дзённай выпрацоўкі. Сярод атрадных перадавікоў—Уладзімір Карпік, Святлана Гук, Барыс Сачанка, Ала Жолудзь. Работа ў дзве змены дае магчымасць больш увагі удзяляць жыццю атрада ў вольны час. «Маланкі», баявыя лісткі своечасова расказваюць аб працоўных справах, поспехах студэнтаў. Дапамога ветэранам вайны, мясцовай школе, канцэрт, падрыхтаваны атраднай агітбрыгадай—вось няпоўны пералік спраў першакурснікаў.

Шмат увагі ўдзяляецца насценнаму друку. Зразумела, у атрадзе — будучыя журналісты.

**М. ЛАХВІЧ.**

# З добрай аддачай

З першакурснікамі хімічнага факультэта, якія на першыя студэнцкія сельгасработы накіраваны ў племсаўгас «Высакоўскі» Клімавіцкага раёна, Магілёўскай вобласці, працавала ў першай палове верасня дацэнт кафедры высокамалекулярных злучэнняў і калоіднай хіміі **Валянціна Міхайлаўна СІДЭРКА.**

Ёй слова:

— Акрамя мяне са студэнтамі першага курса хімічнага факультэта, якія былі разбіты на тры ССГА, на сельгасработы выехалі выкладчык кафедры фізвыхавання В. І. Кашыцын і выкладчык кафедры палітэканоміі І. П. Круглін.

Нашы першакурснікі заняты ў асноўным на сарціроўцы бульбы. Працуюць разам з сельскімі механізатарамі і, трэба адзначыць, працуюць вельмі добра. За прайшоўшы час з дапамогай студэнтаў ужо ўбраны ўраджай з большасці плошчаў.

Самой мне давялося курыраваць у асноўным сельгасатрад «Алеся» 3-й групы першага курса. Такое лірычнае імя носіць атрад мабыць таму, што ў яго саставе адны дзяўчаты. Камандзір Валя Станкевіч і камісар Ларыса Шычко з першых дзён здолелі рытмічна і якасна арганізаваць работу, цікава наладзіць унутрыатраднае жыццё. Дзяўчаты хутка пасябравалі паміж сабой. Сумесна адзначылі 18-годдзе Тані Ціханавец, прысвяцілі гэтай падзеі вершаваны выпуск «маланкі».

Наладжаны сяброўскія кантакты з астатнімі групамі першакурснікаў. Усе нашы камандзіры і камісары кожны дзень разам планавалі і падводзілі вынікі працоўнага дня, імкнуліся, каб ні адзін атрад не адставаў у працы. У сваім атрадзе я магу назваць лепшых студэнтак. Гэта — Ірына Гін, Святлана Гайдук, Ірына Рудава, Оля Смаленская. На іх раўняюцца астатнія. І яшчэ хацелася б адзначыць, як добра, прадумана, па-дзелавому сустрэлі студэнтаў у «Высакоўскім». У нас не было ніякіх нараканняў на арганізацыю работы і быта. Мабыць таму і працуюць нашы першакурснікі з добрай аддачай. Задаволен памочнікамі дырэктар племсаўгаса М. М. Аўчыннікаў.

Запісала **Т. АЛЯКСАНДРАВА.**



**У час сельгасработ байцы атрада «Крышталь» фізічнага факультэта ўзялі абавязацельства выбраць 60 гектараў бульбы. Слова сваё яны трымаюць цвёрда.**

**НА ЗДЫМКУ:** байцы «Крышталя» Тамара **КАВАЛЬ**, Валерый **ХАНЬКО**, Ігар **ЕЛІН**, Ірына **ЛУНІНА** на працоўнай вахце.

Фота М. Дубовіка.

«У апошнія гады нямала было зроблена для забеспячэння больш шырокага прытоку ў вышэйшыя навучальныя ўстановы рабочай і сялянскай моладзі... З вялікім задавальненнем была сустрэта нашым народам такая важная мера, як стварэнне пры ВНУ падрыхтоўчых аддзяленняў».

Л. І. БРЭЖНЕЎ.

(З прамовы на Усесаюзным злёце студэнтаў).

# ЗАПРАШАЕ падрыхтоўчае аддзяленне

## На шляху да ведаў

У 1969 годзе ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову аб стварэнні ў вышэйшых навучальных установах падрыхтоўчых аддзяленняў з мэтай падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ рабочай і сельскай моладзі. З таго часу, ужо дзесяць гадоў, працуе падрыхтоўчае аддзяленне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. За гэты тэрмін падрыхтоўчае аддзяленне закончылі 2087 чалавек. Усе яны сталі студэнтамі, закончылі універсітэт, атрымалі спецыяльнасць і працуюць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі нашай рэспублікі.

За дзесяць гадоў падрыхтоўчае аддзяленне сфарміравалася ў самастойнае падраздзяленне універсітэта. Калі ў 1969 г. было залічана толькі 100 слухачоў, то ў 1979 годзе колькасць слухачоў вырасла да 350 чалавек. На аддзяленні склаліся традыцыйныя формы і метады выхавання і навучання, якія ўзбагачаюцца з кожным годам. Аб гэтым сведчыць той факт, што з «узростам» падрыхтоўчае аддзяленне працуе больш эфектыўна і якасна, рыхтуе працоўную моладзь да ўспрымання і глыбокага засваення універсітэцкай праграмы. З кожным годам павялічваецца працэнт выпуску слухачоў. У гэтым годзе студэнтамі універсітэта сталі 290 слухачоў — 89 працэнтаў ад колькасці залічаных на падрыхтоўчае аддзяленне.

З выдатнымі ведамі закончылі мінулы навучальны год Людміла Баравік, Людміла Драко, Аляксандр Пархімовіч, Анатоль Букляй, Андрэй Кавалёў, Аляксандр Дабрыян, Жанна Матусевіч, Наташа Шыліна, Святлана Кліменка і многія іншыя слухачы, якія цяпер сталі студэнтамі першага курса універсітэта.

У час вучобы на падрыхтоўчым аддзяленні, а затым на факультэтах, юнакі і дзяўчаты хутка далучаюцца да шматграннага жыцця студэнцкага асяроддзя.

Дзеля гэтага на падрыхтоўчым аддзяленні створаны ўсе магчымасці. У нас працуе калектыў высокакваліфікаваных выкладчыкаў, якія спалучаюць школьныя і універсітэцкія метады навучання, выпрацавалі спецыфічныя прыёмы і метадычныя формы навучання юнакоў і дзяўчат, каб аднавіць веданне школьнай праграмы. Сярод выкладчыкаў аўтарытэтныя лектары, метадысты, выхавацелі. Шмат гадоў працуюць на падрыхтоўчым аддзяленні Д. А. Капуцкая, Г. Б. Ван, Н. С. Прыпечанкава, К. В. Рыжанкова, Г. Б. Кажушкова, М. Ф. Чудаеў, Н. І. Сталівоненка, А. Б. Шапілава, С. В. Позняк. Добрым веданнем справы вызначаюцца таксама і маладыя выкладчыкі М. П. Карповіч, В. І. Шыкунова, І. М. Мядзведзь, Э. М. Часноўскі. З першага дня стварэння аддзялення універсітэта працуе старшы лабарант Н. Ч. Доўнар. Адным словам, калектыў добры, ёсць на каго раўняцца, у каго пераймаць вопыт, і ён у поўнай меры спраўляецца са сваёй пачэснай задачай — рыхтаваць на належным узроўні моладзь да вучобы ва універсітэце. Узнагародай за гэту працу служыць шчырая падзяка тых, хто яшчэ толькі пачынае вучобу ва універсітэце, заканчвае яго, або працуе ўжо на вытворчасці. Настаўнікі і інжынеры, партыйныя, камсамольскія работнікі, былыя слухачы з удзячнасцю ўспамінаюць універсітэцкія гады, якія пачыналіся з падрыхтоўчага аддзялення.

Слухачам створаны ўсе ўмовы для вучобы і адпачынку. Яны займаюцца ў добраабсталяваных універсітэцкіх аўдыторыях, карыстаюцца паслугамі бібліятэк, чытальных залаў, могуць атрымаць пуцёўкі ў студэнцкі пансіянат для папраўкі здароўя. Да паслуг слухачоў і кабінет, дзе ёсць літаратура па ўсіх вывучаемых прадметах, сканцэнтраваны і дзейнічаюць тэхнічныя сродкі навучання. Вучэбны працэс на падрыхтоўчым аддзяленні добра забяспечаны метадычнай літаратурай. Па ўсіх прадметах распрацаваны вучэбныя праграмы, многія з іх надрукаваны на ратапрынце, выкладчыкі рыхтуюць метадычныя распрацоўкі па складаных тэмах матэматыкі, фізікі, рускай і беларускай мовы, хіміі, гісторыі і інш.

Наогул, за дзесяць гадоў існавання падрыхтоўчае аддзяленне стала добрай школай падрыхтоўкі працоўнай моладзі да вучобы ва універсітэце, і ў гэтым годзе гатова прыняць новую змену.

**А. СЛУКА,**
**загадчык падрыхтоўчага аддзялення.**



**Пачаўся прыём дакументаў на падрыхтоўчае аддзяленне БДУ. Адной з першых сваю заяву прынесла Ала Заграюк. Яна марыць стаць студэнткай механіка-матэматычнага факультэта.**

**Фота М. Дубовіка.**

## У АДНЫМ СТРАІ

Лепшыя прадстаўнікі прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў! Воіны Савецкай Арміі! Перад вамі шырока расчынены дзверы вышэйшых навучальных устаноў краіны. Вас чакаюць у нашым універсітэце. Партыя і ўрад высока цэняць вашу высакародную працу і стварылі найлепшыя ўмовы для кваліфікаванага прафесіянальнага росту. Учарашні рабочы сёння можа стаць студэнтам. І вельмі дапаможа яму здзейсніць гэты намер падрыхтоўчае аддзяленне.

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення — раўнапраўныя члены ў студэнцкім калектыве. Гэта добрае папаўненне партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай арганізацый універсітэта.

З першых вучэбных дзён, будучы слухачамі падрыхтоўчага аддзялення, вы актыўна ўключайцеся ў работу грамадскіх арганізацый, увесь час памятаючы аб тым, што вы прыйшлі да нас з характарыстыкай «лепшы», «перадавы» і ваша задача не згубіць, зберагчы гэту ацэнку і ў якасці слухача, і ў якасці студэнта, і ва ўсіх іншых чалавечых якасцях.

10 гадоў падрыхтоўчаму аддзяленню. 10 выпускаў. 10 гадоў бесперапыннага ўдасканалення вучэбна-выхаваўчай работы на аддзяленні. З кожным годам паляпшаецца кантынгент слухачоў. Кожны год ідзе працэс адаптацыі слухачоў у студэнцкім калектыве. Працэс усебаковы. Традыцыйныя сустрэчы з дэканамі, выкладчыкамі, актывістамі факультэтаў, дзе слухачы знаёмяцца з жыццём факультэта, больш падрабязна даведваюцца аб выбранай спецыяльнасці і перспектывах яе развіцця; удзел у навуковых студэнцкіх канферэнцыях, школах маладога прапагандыста, мастацкай самадзейнасці універсітэта і факультэтаў; зорныя паходы, камуністычныя суботнікі, будаўнічыя атрады, спартыўныя выступленні і інш.

Слухачы і студэнты ідуць у адным страі. І каб зберагчы сябе ў гэтым страі, слухач, памятай: добрая і выдатная вучоба — тваё першае камсамольскае даручэнне.

**М. КАРПОВІЧ,**
**выкладчык.**

## З ДЗЁННІКА РЭДАКЦЫЙНЫХ СУСТРЭЧ

Адбылася творчая сустрэча работнікаў швейнага і абутковага аб'яднанняў г. Узды з карэспандэнтам нашай газеты Н. Жукавай. Яна расказала моладзі аб гісторыі універсітэта, падрыхтоўчым аддзяленні, аб тых задачах, над вырашэннем якіх працуе калектыў БДУ імя У. І. Леніна сёння.

Жадаючым паступіць на ПА былі растлумачаны правілы прыёму.

Потым камсамольцы і моладзь аб'яднання паведамілі аб сваіх поспехах, аб тым, як яны працуюць і адпачываюць.

Многія з іх, напрыклад, Аляксандр Александровіч, Ірына Цвірко, Зіна Мацкевіч, Маіна Савіцкая, Оля Свірыдовіч і іншыя выказалі жаданне вучыцца на падрыхтоўчым аддзяленні нашага універсітэта.

### БЕЛАРУСКІ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СЛУХАЧОЎ

### НА ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ НА 1979—80 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

**З адрывам ад вытворчасці на спецыяльнасці: беларуская і руская мова і літаратура, журналістыка, гісторыя, філасофія, палітычная эканомія, правазнаўства, матэматыка, механіка, прыкладная матэматыка, фізіка, радыёфізіка і электроніка, біялогія, генетыка, біяхімія, геаграфія, хімія.**

**Паступаючыя на падрыхтоўчае аддзяленне прадстаўляюць: заяву, накіраванне (форма № 1 ці № 2), дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), характарыстыкі (вытворчую ці службовую, камсамольскую ці партыйную), выпіску з працоўнай кніжкі, падпісаную кіраўніком прадпрыемства і заверануюгербавай пячаткай, шэсць фотаздымкаў (3×4 см), медыцынскую даведку (форма № 286).**

**Асобы, накіраваныя на вучобу калгасамі, акрамя таго, прадстаўляюць выпіску з пратакола агульнага сходу калгаснікаў аб прыёме ў члены калгаса.**

**Дакументы прымаюцца з 20 верасня па 31 кастрычніка. Субяседаванне з 20 па 25 кастрычніка. Ад асоб, звольненых у запас з радоў Савецкай Арміі пасля 1 лістапада, дакументы прымаюцца да 15 студзеня. Субяседаванне з імі праводзіцца па меры паступлення дакументаў. Яўка на субяседаванне і заняткі па выкліку. Заняткі — з 1 лістапада.**

На падрыхтоўчае аддзяленне прымаюцца юнакі і дзяўчаты, якія маюць сярэднюю адукацыю, з ліку перадавых рабочых, калгаснікаў, звольненых у запас з радоў Савецкай Арміі, па накіраваннях прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, арганізацый транспарту і сувязі, геолагаразведачных арганізацый, саўгасаў і калгасаў, камандавання воінскіх часцей, а таксама вызваленыя сакратары партыйных, камсамольскіх арганізацый, старшыні прафсаюзных арганізацый, калі яны да выбару на вызваленыя пасады працавалі не менш года рабочымі ці калгаснікамі.

Прамысловыя прадпрыемствы могуць накіроўваць на вучобу лабарантаў і кантралёраў, калі іх праца аплачваецца па тарыфнай сетцы рабочых, што павінна быць пацверджана запісам у працоўнай кніжцы.

Члены калгасаў могуць быць накіраваны на вучобу незалежна ад роду іх заняткаў. Саўгасы маюць права накіроўваць толькі рабочых.

Асобы, якія закончылі дзённыя агульнаадукацыйныя школы, прымаюцца пры наяўнасці працоўнага стажу не менш аднаго года пасля заканчэння школы. Час работы ў якасці вучняў на прадпрыемствах і ў перыяд летніх канікул не улічваецца.

Той, хто закончыў сярэднія спецыяльныя вучэбныя установы і прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы і мае сярэднюю адукацыю, прымаецца на аддзяленне, калі ён з'яўляецца рабочым ці калгаснікам і працаваў па накіраванні пасля заканчэння вучэбнай установы на працягу тэрміну, устаноўленага заканадаўствам.

Звольненыя ў запас з радоў Савецкай Арміі прымаюцца на падрыхтоўчае аддзяленне на працягу першага года пасля заканчэння службы па накіраванню камандавання воінскіх часцей.

Асобы, якія не маюць накіраванняў з воінскіх часцей і якія вярнуліся на тыя прадпрыемствы, дзе яны працавалі да прызыву у армію, не пазней 3-х месяцаў пасля звальнення у запас, могуць паступаць на аддзяленне па накіраваннях гэтых арганізацый, калі агульны стаж іх працы на дадзеных прадпрыемствах складае ў сукупнасці не менш года. Пры гэтым яны прадстаўляюць характарыстыкі ад камандавання воінскіх часцей і ад кіраўніцтва прадпрыемстваў.

Прыёмная камісія перад залічэннем праводзіць з паступаючымі індывідуальнае субяседаванне па прадметах, якія здаюць абітурыенты пры паступленні на першыя курсы адпаведных факультэтаў.

Слухачам выплачваецца стыпендыя ў размеры 40 рублёў, паступіўшым на вучобу па накіраванню (форма № 2) — на 15 працэнтаў вышэй. Іншагароднім прадастаўляецца інтэрнат.

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення па сканчэнні навучання здаюць выпускныя экзамены. Паспяхова здаўшыя экзамены, залічваюцца на першы курс дзённага навучання без здачы ўступных экзаменаў на спецыяльнасць згодна пададзенай заявы.

Дакументы высылаць па адрасу: 220080, Мінск-80, Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна, падрыхтоўчае аддзяленне.

**Рэктарат.**



*«ПАВАЖАНАЯ РЭДАКЦЫЯ!*

*У верасні споўнілася 10 гадоў з дня заснавання вядомага беларускага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры». Калі ёсць у вас такая магчымасць, просім расказаць аб іх на старонках нашай шматтыражкі.*

*З удзячнасцю — група студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта».*

**Сёння рэдакцыя прапануе сваім чытачам матэрыял аб ансамблі. А наш пазаштатны карэспандэнт В. Маскалёў пабываў у час выступлення «Песняроў» на Беларускім тэлебачанні і зрабіў здымкі.**

**СПАТКАННЕ СА СВЕТАМ ЦУДОЎНАГА**

# Вернасць народным традыцыям

Пясняр—гэта не проста спявак, але і паэт, казачнік, які пяе пра сваю родную зямлю, свой народ. Вось такімі спевакамі са сваёй выразнай грамадзянскай, мастацкай пазіцыяй сталі беларускія музыканты — вакальна - інструментальны ансамбль «Песняры».

Пачатак быў цяжкім. Была ідэя арганізаваць калектыў, аснову рэпертуару якога складала б беларуская народная песня, убачаная і «прачытаная» днём сённяшнім. Ансамбль звярнуўся да таго, міма чаго праходзілі яго калегі па жанру,— славянскай мелодыцы з суадноснай гарманізацыяй: у традыцыйны біг—бітавы склад былі ўведзены дудачка, цымбалы, ліра, скрыпка. Смела распрацоўваючы фальклорныя элементы, ансамбль паказаў сябе наватарам жанру, узначаліў цэлы напрамак, які носіць назву «фальклорны біт». Стаць актыўным прапагандыстам і папулярызатарам песеннага мастацтва свайго народа і праз злучэнне, здавалася б, не злучаемага — някідкай пранікнёнай народнай песні з яркасцю сучасных аранжыровак, прымусіць маладых і немаладых па-новаму адкрываць для сябе народныя мелодыі—вось асноўныя задачы, якія паставілі перад сабой «Песняры».

Іх прынялі не адразу. Была і крытыка, было і недавер'е ў магчымасць з'яднання старыннай народнай песні з сучасным рытмам. Але «Лявоны» — так называўся спачатку ансамбль— з уласцівым ім энтузіязмам прыняліся за здзяйсненне пастаўленых задач. Пошук стаў дэвізам маладых музыкантаў на ўсе наступныя гады і адзіным з адказаў на пытанне аб стабільнасці яго папулярнасці.

Своеасаблівым выпрабаваннем «Песняроў» на трываласць стаў IV Усесаюзны конкурс артыстаў эстрады ў Маскве, які адбыўся ў кастрычніку 1970 года. Тут вакальна-інструментальны ансамбль быў афіцыяльна аб'яўлены лаўрэатам конкурсу. Іменна гэта перамога, падтрымка мільённай публікі прынеслі ўпэўненасць у правільнасці выбранага напрамку. І як вынік — ужо ў наступным годзе — поспех на міжнароднай арэне, у Сопаце, дзе «Песняры» прадстаўлялі айчынны грамзапіс. Затым выступленне на X Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Берліне, гастролі па Савецкаму Саюзу, Чэхаславакіі, ГДР, Балгарыі, ФРГ, Югаславіі, ЗША...

З самага пачатку «Песняры» імкнуліся быць ансамблем для ўсіх, сабіраючы ў канцэртных залах зусім розных слухачоў. Моладзь прыцягвалі напружаны, выразны рытм, арыгінальнасць трактоўкі песеннай спадчыны, людзей старэйшага пакалення — магчымасць пачуць любімыя народныя песні, цудоўны вакал, адкрытая народная манера выканання, вернасць фальклорным традыцыям.

У ансамблі пяюць усе. Галасы «Песняроў» зліваюцца ў адну мелодыю з гукамі ўсіх музычных інструментаў, пачынаючы ад акардэона, дудачкі, скрыпкі і заканчваючы сінтэзатарам з камп'ютэрнай памяццю. Цудоўная меладычнасць «Александрыны», «Беларусі», «Завушніц», «Волагды» пакарае слухача.

Кожнае выступленне ансамбля — тэатральнае прадстаўленне. Калектыў працуе не толькі над песнямі. Вялікая работа вядзецца і над творамі больш складанага характару, кампазіцыі. Так, паспяхова прайшло выступленне ансамбля з операй «Песня пра долю» на словы вялікага беларускага песняра ў апрацоўцы кіраўніка ансамбля заслужанага дзеяча культуры БССР У. Мулявіна.

Мастацтва ансамбля як быццам бы нараджаецца на вачах у заўсёды абноўленым руху, жэстах, інтанацыях. Бо раз і назаўсёды завучаных інтанацый у «Песняроў» няма, яны ніколі не пяюць адну і тую ж песню аднолькава — гэта вынік мастацкага ўвасаблення асноўных прынцыпаў работы над песняй.

«Песнярам» дзесяць гадоў. І ўвесь гэты час калектыў ідзе ў нагу з сучасным музычным мастацтвам, захоўваючы свой творчы твар. Высокі мастацкі густ, эстэтычнасць, патрабавальнасць да сябе і павага да слухача, працаздольнасць— усё гэта «Песняры», лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі, усесаюзных і міжнародных конкурсаў. Дзесяткі народных песень, атрымаўшых другое жыццё, пяць доўгаіграючых пласцінак, здымкі ў кінафільмах, дзве оперы... Іх спяванне прыцягвае і заахвочвае сапраўдным пачуццём, чысцінёй інтанацыі, глыбокім пранікненнем у характар музычна-паэтычных вобразаў. З аднаго боку сучаснасць, з другога — традыцыя, музычная вобразнасць і тэхніка. І ўсё-такі галоўная прычына поспеху— «Песняры» свята верань у тое, што робяць. І аддаюць сваёй творчасці ўсё без аглядкі і эканоміі.

**По матэрыялах перыядычнага друку падрыхтавала С. ІВАНОВА.**



**НА ЗДЫМКАХ: выступаюць «Песняры»; уважліва сочыць за запісам канцэрта на студыі У. Мулявін.**

Фота **В. Маскалёва.**

# СЕМ ДЗЁН БДУ

## На агульным сходзе

замежных студэнтаў-першакурснікаў, якія ў гэтым годзе паступілі ў БДУ, з кароткай інфармацыяй аб гісторыі развіцця універсітэта выступіў дэкан па рабоце з замежнымі студэнтамі дацэнт М. В. Прылепка. Усе першакурснікі былі азнаёмлены з правамі і абавязкамі замежных навучэнцаў, з правіламі пражывання ў студэнцкім інтэрнаце. Ва ўрачыстай абстаноўцы ім былі ўручаны студэнцкія білеты і заліковыя кніжкі.

Напярэдадні свайго пасвячэння ў студэнты, 18 верасня, замежныя студэнты-першакурснікі былі ўдзельнікамі экскурсіі па святых для нашага народа мясцінах. Яны наведалі Курган Славы і мемарыяльны комплекс Хатынь.

## Супрацоўнікі бібліятэкі,

якая пасля рамонту прыняла першых наведвальнікаў, абнавілі кніжныя стэнды і выстаўкі, што пастаянна экспануюцца на другім і трэцім паверхах. Увагу прыцягвае падборка «Будучае пачынаецца сёння» (аб прагназіраванні вышэйшай адукацыі). Выстаўка «Ідэалагічная барацьба і камуністычнае выхаванне» складаецца з чатырох раздзелаў: «XXV з'езд аб актуальных задачах камуністычнага выхавання», «Комплексны падыход да сістэмы выхаваўчай работы», «Роля грамадскіх навук у камуністычным выхаванні», «Ваенна-патрыятычнае і інтэрнацыянальнае выхаванне». Удала аформлены стэнд «Беларусь у 10-й пяцігодцы».

Падборкі кніг на трэцім паверсе знаёмяць першакурснікаў з універсітэтам, з кнігамі і манаграфіямі нашых супрацоўнікаў, вучаць пачынаючых студэнтаў методыцы работы з кнігай.

## На мехмаце адбылося

чарговае пасяджэнне групы садзейнічання набору слухачоў на падрыхтоўчае аддзяленне, кіруе якой загадчык кафедры функцыянальнага аналізу, дацэнт Я. В. Радыно. У складзе групы 17 супрацоўнікаў механіка-матэматычнага факультэта. Найбольш актыўныя з іх: асістэнт кафедры дыферынцыяльных ураўненняў В. А. Прокашава, старшы выкладчык кафедры тэорыі функцый А. У. Самсонаў, асістэнт кафедры функцыянальнага аналізу В. У. Брэнер, асістэнт кафедры тапалогіі матэматычнай логікі А. І. Жук.

Члены групы даслалі ў школы абласных цэнтраў рэспублікі пісьмы з запрашэннем на ПА выпускнікоў мінулых гадоў, выступаюць з лекцыямі аб падрыхтоўчым аддзяленні на многіх прадпрыемствах Мінска, плануюць арганізаваць агітацыйныя выезды на буйныя прадпрыемствы рэспублікі.

## Са святкавання 400-годдзя

Вільнюскага універсітэта імя В. Капсукаса вярнуўся народны ансамбль народнага танца «Крыжачок». Свята літоўскіх студэнтаў урачыста адзначала ўся рэспубліка. У госці да сяброў прыехалі прадстаўнікі РСФСР, Латвіі, Эстоніі, Беларусі і іншых саюзных рэспублік.

Цэнтрам свята стаў Вільнюскі Палац спорту, які ўмясціў больш за 6 тысяч удзельнікаў. У святочным канцэрце са своеасаблівай візітнай карткай, — танцам «Крыжачок», — выступілі прадстаўнікі мастацкай самадзейнасці БДУ. Яны прывезлі з Вільнюса ганаровы дыплом удзельніка святкавання 400-годдзя універсітэта імя В. Капсукаса.

## VIII спартакіяда «Здароўе»

праводзілася ў Белдзяржуніверсітэце па 16 відах спорту. У ёй прымалі ўдзел амаль 1200 выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Паралельна з гэтым удзельнікі спартакіяды прымалі ўдзел у абласной спартакіядзе «Здароўе», на якой занялі другое месца. Іншыя спартсмены былі ўзнагароджаны граматамі і каштоўнымі падарункамі.




Праляцела лета — пара паходаў, паездак. У розных кутках краіны пабывалі рабяты, шмат чаго ўбачылі. Каля 750 нашых студэнтаў адпачывалі сёлета ў спартыўна-аздараўленчым лагеры на возеры «Нарач».

У кожную з трох змен спартыўным камітэтам універсітэта праводзіліся лагерныя спартакіяды па 9 відах спорту, сярод якіх былі валейбол, футбол, настольны тэніс, шашкі, лёгкаатлетычная эстафета і інш. За перыяд работы лагера было падрыхтавана каля 300 спартсменаў-разраднікаў, каля ста навучаліся плаванню. У лагеры былі створаны ўсе ўмовы для далейшага павышэння майстэрства.

Акрамя гэтага ў «Нарачы» вялася вялікая культурна-масавая, выхаваўчая работа. Дружна папрацавалі рабяты ў суседнім калгасе, а грошы, зробленыя там, былі перададзены ў Фонд міра. Кожны атрад праводзіў вечары адпачынку, выязджаў з канцэртамі ў дом адпачынку «Нарач», выступаў перад удзельнікамі аўтапоезда «Дружба», піянерамі лагера «Зубронак».

* * *

Летам у Гродна праходзіла першынство Белсавета ДСТ «Буравеснік» па лёгкай атлетыцы, у якім прыняла ўдзел зборная каманда універсітэта ў саставе 18 чалавек. Універсітэцкая зборная заняла 3-е месца, уступіўшы РТІ і ГДУ. Сталі чэмпіёнамі, паказаўшы найлепшыя вынікі М. Байтова (выкладчыца кафедры фізвыхавання) — кіданне дыска і І. Чурсіна (студэнтка IV курса хімфака) — бег на 100 м.

* * *

Трое лепшых спартсменаў—лёгкаатлетаў прымалі гэтым летам удзел у VII летняй Спартакіядзе народаў СССР у Маскве: Л. Клемянцёнак (студэнтка IV курса біяфака), Т. Бойка (студэнтка V курса юрфака), выкладчык кафедры фізвыхавання А. Башаркевіч.

Т. Бойка заваявала права стаць кандыдатам у зборную каманду для ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях-80.

* * *

У гэтыя дні спорткалектыў універсітэта рыхтуецца да маючых адбыцца спаборніцтваў — XXIII студэнцкай спартакіяды ДСТ «Буравеснік». Ужо ў кастрычніку пачнуцца папярэднія спаборніцтвы па гульневых відах спорту. Хутка адбудуцца XXVIII агульнауніверсітэцкая спартакіяда, спаборніцтвы па кросу, здачы норм ГПА, турызму і лёгкай атлетыцы.

**І. САВЕТКІНА.**

**Беларускі універсітэт**

**27 ВЕРАСНЯ 1979 г.**

**Заказ № 1473. АТ 10845**

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.**

**ТЭЛЕФОН 22-07-19**

**В. а. рэдактара**

**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**